Вось чатыры малых на зямлі, але яны мудрэйшыя за мудрых: Мурашы- народ магутны, але летам запасае ежу сваю… Прытчы 30:25



# Насякомыя, якія жывуць у супольнасці

Шматлікія насякомыя жывуць паасобку, але ёсць насякомыя, якія жывуць у супольнасці. Такія насякомыя называюцца «сацыяльнымі», тамушто яны жывуць і працуюць разам. Іх калоніі утвараюць адзін вялікі арганізм, дзе жывуць тысячы жыхароў.







Вы шмат разоў бачылі ў лесе мурашнік, гэта дом мурашоў, але мы бачым толькі тое, што над зямлёю, а асноўная частка мурашніка знаходзіцца пад зямлёю. Гэтыя малыя тварэнні вельмі працавіта будуюць сабе дом.

# У БІБЛІІ БОГ КАЖА:

Ідзі да мураша, ляніўца, паглядзі на яго справы, і будзь мудрым. Няма ў яго ні начальніка, ні гаспадара, ні ўладара, а ён нарыхтоўвае летам хлеб свой, збірае пад час жатвы ежу сваю.





А што гэта за маленькія белыя камячкі схаваныя ў зацішных кутках вялікага мурашніка? Думаеш, гэта запасы ежы? А вось і не! Гэта ЯЙКІ, з якіх вылупяцца маленькія *мурашы*. Калі мурашніку пагражае небяспека, сталыя мурашкі ў першую чаргу ратуюць яйкі.



А адкладае яйкі і выводзіць дзетак МУРАШЫНАЯ ЦАРЫЦА. Таму яна ў мурашніку самая галоўная.

Ну, а астатнія мурашкі клапоцяцца, каб у іх царыцы і маленькіх *мурашак* заўсёды была ежа, каб ім было цепла і ўтульна.






ПРАЦОЎНЫЯ МУРАШКІ адпраўляюцца далёка ў лес і збіраюць здабычу: мёртвых жукоў і вусеняў, зялёныя лісточкі, травінкі і галінкі для будаўніцтва

.

У мурашніку ёсць адважныя МУРАШКІ-САЛДАТЫ, якія ахоўваюць уваходы ў мурашнік ад няпрошаных госцяў і пры любой небяспецы гатовыя рынуцца ў бой супраць ворагаў.



# ЛЕПШЫ ПАСТУХ

Мурашкі — актыўныя драпежнікі, але разам з тым яны трымаюць і «хатніх жывёл». У ролі «каровы» выступае тля, прычым ядуць мурашкі не толькі яе саму, але і вадкасць, якую яна выпускае- нібы малако. Мурашкі пасуць тлей на раслінах, засцерагаюць іх. І па першым патрабаванні тля вылучае ім лішкі нектара. Каб «выдаіць» тлю, мурашка казыча вусікамі яе жывоцік.








А ці ведаеш ты, што мурашкі заўсёды знаходзяць дарогу дахаты, нават калі вельмі-вельмі далёка сыйдуць ад роднага хаты. Як ім гэта атрымоўваецца? Вельмі проста: сыходзячы яны распырсківаюць адмысловую пахкую вадкасць і знаходзяць зваротную дарогу па паху.



А гэта яшчэ хто вісіць уніз галавой на столі мурашніка? А гэта адмысловыя мурашкі, якія запасяць у сябе ў жываце салодкі кветкавы сок, і калі харчы ежы ў каморках падыходзяць да канца, яны выпускаюць гэты сок і кормяць сваіх суродзічаў

# МУРАШНІК

1. Пакрыццё з іголак і галінак.
2. "Саляры" - камера, якая награваецца прамянямі сонца. Увесну насельнікі забегаюцца сюды пагрэцца.
3. Адзін з уваходаў. Ахоўваецца салдатамі. Служыць вентыляцыйным каналам.
4. "Могільнік". Сюды працоўныя мурашкі адносяць памерлых субратаў і смецце.
5. Зімавальная камера.
6. "Хлебны свіран". Тут мурашкі захоўваюць зерні.
7. Царская камера, дзе жыве матка, якая адкладвае да паўтары тысяч яйкаў у дзень.
8. Камеры з яйкамі, лічынкамі і лялячкамі.
9. "Кароўнік", дзе мурашкі ўтрымоўваюць тлей.
10. "Мясная каморка", куды здабыдчыкі прыносяць гусеніц і іншую здабычу.



# ПЧОЛЫ



Пчолы жывуць разам у вулеі, які складаецца з маленькіх ячэяк у форме шасцівугольніка. Гэты дом пчолы будуюсь з воску.



Галоўная у вулеі царыца. Яна адкладае яйкі у некаторыя такія ячэйкі. Мёд і пыльца захоўваюцца ў іншых.

У вулеі існуе размеркаванне адказнасцей. Маладыя пчолы даглядаюць і кормяць лічынак, якія адкладае царыца. Больш старэйшыя пчолы будуюць вулей і абараняюць яго ад нежаданых гасцей.






Працоўныя пчолы летам жывуць не больш за 30 дзён. Толькі тады, калі ім ужо споўнілася 3 тыдні яны становяцца “здабыдчыкамі”, і лятаюць збіраць нектар.

Нектар і пыльцу пчолы перарабляюць у мёд і воск. Мёдам яны харчуюцца ў зімку і кормяць лічынак і трутняў-самцоў пчол.







Пчала можа лётаць ад вулея на адлегласці 3-5 кіламетраў і заўсёды вяртаецца назад. Калі яна вяртаецца, яе мядовы страўнік поўны і на нагах шмат пыльцы. Перад тым, як запоўніць ячэйку мёдам, пчала частуе гэтым мёдам іншых “здабыдчыц” і расказвае ім, дзе яна знайшла нектар. Расказвае яна пры дапамозе “танца”.



# ПАПЯРОВЫЯ ВОСЫ

Папяровыя восы называюцца так, тамушта іх вулей яны будуюць з паперы, якую выраблюць самі з маленькіх кавалкаў драўніны з дапамогай сліны.



Пачынае будаваць дом царыца, пасля яна адкладае некалькі лічынак, з якіх вылупляюцца працоўныя восы, якія працуюць далей. Працоўныя восы кормяць лічынак і царыцу  нектарам і перажыванай дабычай (звычайна невялікія насякомыя). Зіму перажывае толькі царыца





# ВОСЫ НАВУЧЫЛІ ЧАЛАВЕКА РАБІЦЬ КАНДЫЦЫЯНЕР

Гатовае гняздо нагадвае шар, у якім амаль няма адтулін. Каб паветра паступала ў вулей восы пакінаюць некалькі ячэяк адчыненымі і пастаянна лётаюць вакол іх і махаюць крыламі. Так яны вентылююць прастору гнязда.



# МАЛАЙЦЫ!

